АБ СТАНЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

У зваротах, у прыватнасці, ставіліся пытанні аб неабходнасці выключэння калізій, прабелаў, прававой недакладнасці ў кодэксах Рэспублікі Беларусь (аб адміністрацыйных правапарушэннях, аб адукацыі, Жыллёвым, Падатковым і інш.), законах «О пенсионном обеспечении», «О вспомогательных репродуктивных технологиях», «О свободе совести и религиозных организациях», «Об оказании психиатрической помощи», некаторых дэкрэтах і ўказах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановах Савета Міністраў, пастановах пленумаў Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага судоў, актах міністэрстваў і іншых дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь.

1. Так, на падставе звароту грамадзяніна Канстытуцыйным Судом прынята рашэнне ад 25 верасня 2013 г. «Об установлении процессуального порядка освобождения от уплаты государственной пошлины за подачу в суд жалоб на постановления по делам об административных правонарушениях».

Па меркаванні Канстытуцыйнага Суда, адсутнасць у грамадзяніна магчымасці заплаціць дзяржаўную пошліну ў сувязі з яго маёмасным становішчам не павінна перашкаджаць ажыццяўленню ім права на судовую абарону, у тым ліку ў адміністрацыйным працэсе, паколькі іншае азначала б невыкананне норм Канстытуцыі, якія гарантуюць кожнаму абарону дзяржавай яго правоў і свабод, у тым ліку судовую. Адной з важнейшых гарантый рэалізацыі такога права з'яўляецца ўстанаўленне ў заканадаўстве, якое рэгулюе адміністрацыйны працэс, працэсуальнага парадку вызвалення грамадзян ад выплаты дзяржаўнай пошліны пры падачы ў суд скарг на пастановы па адміністрацыйных справах. Адсутнасць у працэсуальным заканадаўстве прававых норм, якія ўстанаўліваюць адзіны падыход да прававога рэгулявання грамадскіх адносін, звязаных з вызваленнем ад выплаты дзяржаўнай пошліны, не садзейнічае фарміраванню аднастайнай правапрымяняльнай практыкі.

У мэтах забеспячэння канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права, рэалізацыі канстытуцыйнага права кожнага на судовую абарону і ліквідацыі прабелу ў заканадаўстве, якое ўстанаўлівае парадак адміністрацыйнага працэсу, Канстытуцыйны Суд прызнаў неабходным унясенне ў Працэсуальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях дапаўненняў у частцы вызначэння парадку вызвалення судом (суддзёй) фізічных асоб ад выплаты дзяржаўнай пошліны за падачу ў суд скарг на пастановы па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях.

2. У сувязі са зваротамі грамадзян Канстытуцыйным Судом прынята рашэнне ад 16 кастрычніка 2013 г. «Об ограничении дееспособности гражданина вследствие психического расстройства».

Па меркаванні Канстытуцыйнага Суда, існуючы прававы механізм, які не ўлічвае ступень фактычнага зніжэння або аднаўлення здольнасці грамадзяніна ў пэўнай меры разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі з прычыны псіхічнага расстройства, сведчыць аб канстытуцыйна-прававым прабеле ў заканадаўчым рэгуляванні грамадскіх адносін, звязаных з прызнаннем грамадзяніна недзеяздольным.

Выходзячы з узаемазвязаных палажэнняў артыкулаў 1, 2, 21, 23, 53, 59 Канстытуцыі і міжнародна-прававых актаў у сферы абароны правоў псіхічна хворых асоб, у мэтах выканання канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права, забеспячэння канстытуцыйных гарантый правоў і законных інтарэсаў грамадзян і ліквідацыі прабелу ў заканадаўстве Канстытуцыйны Суд прызнаў неабходным унясенне змяненняў і дапаўненняў у ГрПК у частцы замацавання магчымасці абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна з прычыны псіхічнага расстройства (душэўнай хваробы або слабага розуму) у залежнасці ад ступені фактычнага зніжэння здольнасці разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі і прызнання абмежавана дзеяздольным грамадзяніна, раней прызнанага недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (душэўнай хваробы або слабага розуму), у выпадку аднаўлення яго здольнасці разумець у пэўнай меры значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, а таксама замацавання грамадзянска-прававых вынікаў прызнання судом грамадзян, якія пакутуюць на псіхічныя расстройствы, абмежавана дзеяздольнымі.

3. У рашэнні ад 11 снежня 2013 г. «О правовом регулировании порядка разрешения споров, связанных с расследованием несчастных случаев на производстве» Канстытуцыйны Суд прыйшоў да высновы аб тым, што Урад Рэспублікі Беларусь, рэалізуючы дэлегаванае яму заканадаўчымі актамі паўнамоцтва ўстанаўліваць парадак расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, не меў права разам з гэтым ажыццяўляць прававое рэгуляванне пытанняў судаводства, уключаючы ўстанаўленне ўмоў рэалізацыі канстытуцыйнага права на судовую абарону.

Акрамя таго, Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу на тое, што ў адпаведнасці з Правіламі расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, зацверджанымі пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 студзеня 2004 г. № 30, права пацярпеўшага і іншых зацікаўленых асоб на судовую абарону знаходзіцца ў залежнасці ад правядзення дзяржаўным інспектарам працы расследавання няшчаснага выпадку на вытворчасці і складання па яго выніках заключэння. Права на зварот у суд у выпадках, калі дзяржаўным інспектарам працы заключэнне не складаецца, дадзенымі Правіламі не прадугледжана, у сувязі з чым у адносінах да ўказаных асоб не забяспечваецца канстытуцыйнае права на судовую абарону.

У мэтах выканання прынцыпу вяршэнства права, рэалізацыі канстытуцыйнага права кожнага на судовую абарону і ліквідацыі прававой недакладнасці Канстытуцыйны Суд прапанаваў Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь забяспечыць узгадненне ўказаных Правіл з нормамі Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — ПК) і іншых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь у частцы прававога рэгулявання парадку вырашэння спрэчак, звязаных з расследаваннем няшчасных выпадкаў на вытворчасці.

Дзейнасць Канстытуцыйнага Суда па ліквідацыі прабелаў, калізій і прававой недакладнасці ў нарматыўных прававых актах накіравана на забеспячэнне эфектыўнага прававога рэгулявання грамадскіх адносін на падставе прынцыпаў і норм Канстытуцыі і патрабуе аператыўнай работы нарматворчых органаў па дасягненні ўзгодненасці і несупярэчлівасці прававых прадпісанняў.

IV

Выкананне рашэнняў Канстытуцыйнага Суда, з'яўляючыся важнейшым паказчыкам стану канстытуцыйнай законнасці ў дзяржаве ў цэлым, сведчыць таксама аб нацэленасці і гатоўнасці дзяржаўных органаў, іх службовых асоб кіравацца патрабаваннямі Канстытуцыі, сцвярджаць яе вяршэнства і непасрэднае дзеянне на тэрыторыі краіны, дапамагаючы тым самым эфектыўнаму функцыянаванню дзяржаўных інстытутаў і павышэнню даверу да іх грамадзян.

Ацэньваючы своечасовасць выканання сваіх рашэнняў, Канстытуцыйны Суд адзначае ў асноўным станоўчыя вынікі дзейнасці дзяржаўных органаў і службовых асоб па прыняцці імі неабходных мер, абазначаных у тым ліку ў рашэннях Суда.

Станоўчай тэндэнцыяй з'яўляецца перш за ўсё ўлік заканадаўцам прыў ажыццяўленні заканатворчай дзейнасці прававых пазіцый Канстытуцыйнага Суда, сфармуляваных ім у рашэннях па выніках ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў, прынятых Парламентам і прадстаўленых Прэзідэнту на подпіс.

1. У прыватнасці, кіруючыся прынцыпам прававой дакладнасці, Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 22 снежня 2009 г. звярнуў увагу на тое, што ў адпаведнасці з Законам «О внесении изменений и дополнений в некоторые кодексы Республики Беларусь по вопросам уголовной и административной ответственности» у санкцыі часткі 2 артыкула 317[1] КК заканадаўцам устаноўлены ніжняя і верхняя (ад трохсот да тысячы базавых велічынь) межы штрафу за ўчыненне канкрэтнага злачынства.

У выніку, па меркаванні Канстытуцыйнага Суда, узнікла супярэчнасць паміж нормамі Агульнай і Асаблівай частак КК, паколькі згодна з часткай 1 артыкула 62 КК пры назначэнні пакарання ў выглядзе штрафу суд кіруецца межамі, устаноўленымі артыкулам 50 КК (ад трыццаці да адной тысячы базавых велічынь), што выключае магчымасць устанаўлення заканадаўцам межаў штрафу ў артыкулах Асаблівай часткі КК. У сувязі з гэтым Канстытуцыйны Суд указаў таксама на парушэнне прынцыпаў і сістэмы пабудовы норм Агульнай і Асаблівай частак КК.

Дадзеная прававая пазіцыя Канстытуцыйнага Суда рэалізавана ў Законе ад 12 ліпеня 2013 года «О внесении изменений и дополнений в некоторые кодексы Республики Беларусь по вопросам усиления мер ответственности за управление транспортным средством в состоянии опьянения». У выкладзеным у новай рэдакцыі артыкуле 317[1] КК межы штрафу не ўказваюцца.

2. У рашэнні ад 28 снежня 2009 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «О внесении дополнений и изменений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам осуществления административных процедур» Канстытуцыйным Судом звернута ўвага на неабходнасць забеспячэння аднастайнага заканадаўчага падыходу да рэгулявання сходных праваадносін і ў сувязі з гэтым адзначана, што прымяняльна да выпадкаў ліквідацыі грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый, іх саюзаў, рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў пераваным Законам не ўстанаўліваецца неабходнасць выключэння запісаў аб іх дзяржаўнай рэгістрацыі з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, што з'яўляецца абавязковым у сілу патрабаванняў Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 студзеня 2009 г. № 1 «О государственной регистрации и ликвидации (прекращении деятельности) субъектов хозяйствования».

Указаная прававая пазіцыя Канстытуцыйнага Суда ўлічана ў Законе ад 4 лістапада 2013 года «О внесении дополнений и изменений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам деятельности политических партий и других общественных объединений», палажэннямі якога прадугледжваецца абавязак адпаведнага рэгіструючага органа ўнесці запісы ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў і ў Дзяржаўны рэестр грамадскіх аб'яднанняў, саюзаў або рэестр мясцовых грамадскіх аб'яднанняў, саюзаў аб выключэнні з іх грамадскага аб'яднання, саюза, а таксама абавязак Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь унесці запісы ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў і Дзяржаўны рэестр палітычных партый, саюзаў аб выключэнні з іх палітычнай партыі, саюза.

3. У Законе ад 12 снежня 2013 года «О внесении изменений и дополнения в программные законы Республики Беларусь» улічана прававая пазіцыя Канстытуцыйнага Суда, выкладзеная ім у рашэннях ад 27 снежня 2008 г. і ад 19 кастрычніка 2012 г., у адпаведнасці з якой змяненні і дапаўненні ў праграмныя законы павінны прымацца ў выглядзе асобных законаў з выкананнем патрабавання часткі чацвёртай артыкула 104 Канстытуцыі (аб кваліфікаваным галасаванні).

4. Шэраг прававых пазіцый Канстытуцыйнага Суда рэалізаваны заканадаўцам у Законе «О внесении изменений и дополнений в Трудовой кодекс Республики Беларусь» (далей — Закон аб унясенні змяненняў у ПК).

4.1. Так, у рашэнні ад 5 сакавіка 2009 г. «О правовом регулировании выплаты выходного пособия» Канстытуцыйны Суд указаў, што неадназначнае разуменне і прымяненне прававых норм, якія рэгулююць выплату выходной дапамогі і мінімальнай кампенсацыі за пагаршэнне прававога становішча работніка пры скасаванні кантракта з-за невыканання або неналежнага выканання яго ўмоў па віне наймальніка, прывяло да фактычнага выключэння магчымасці атрымання выходной дапамогі, прадугледжанай часткай трэцяй артыкула 41 ПК. Па меркаванні Канстытуцыйнага Суда, выпадкі, калі выходная дапамога не выплачваецца, павінны вызначацца толькі на ўзроўні закона, у сувязі з чым было прызнана неабходным унесці адпаведныя змяненні і дапаўненні ў артыкулы 41 і 48 ПК.

У адпаведнасці з Законам аб унясенні змяненняў у ПК унесены змяненні і дапаўненні ў артыкулы 41 і 48 дадзенага Кодэкса, якія дазваляюць дакладна вызначыць нарматыўныя прававыя акты, што падлягаюць прымяненню пры ўстанаўленні памеру выходной дапамогі работнікам, якім актамі заканадаўства прадугледжана выплата мінімальнай кампенсацыі за скасаванне тэрміновага працоўнага дагавора.

4.2. У рашэнні ад 17 ліпеня 2009 г. «Об обеспечении равных прав граждан в сфере труда» Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу на тое, што адсутнасць ва ўстаноўленым працоўным заканадаўствам пераліку дыскрымінацыйных абставін указанняў на ўзрост, месца жыхарства, роўна як і вычарпальны характар дадзенага пераліку, значна абмяжоўвае гарантыі рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян на працу, і прапанаваў Савету Міністраў падрыхтаваць праект закона аб унясенні адпаведных дапаўненняў у ПК.

Згодна з выкладзенай Законам аб унясенні змяненняў у ПК часткай першай артыкула 14 ПК у новай рэдакцыі да дыскрымінацыйных абставін у сферы працоўных адносін аднесены ўзрост, месца жыхарства і іншыя абставіны, не звязаныя з дзелавымі якасцямі і не абумоўленыя спецыфікай працоўнай функцыі работніка.

4.3. У рашэнні Канстытуцыйнага Суда ад 16 снежня 2009 г. «О необходимости разрешения коллизии между нормами законодательных актов, предусматривающих дополнительное основание прекращения трудового договора по пункту 5 статьи 47 Трудового кодекса Республики Беларусь» звернута ўвага на наяўную калізію паміж нормамі часткі другой артыкула 16, часткі пятай артыкула 17 Закона «О борьбе с коррупцией» і пункта 5 артыкула 47 ПК у дачыненні да спынення працоўнага дагавора з дзяржаўнай службовай асобай пры непадпісанні або парушэнні ёю пісьмовага абавязацельства па выкананні ўстаноўленых абмежаванняў. У мэтах вырашэння ўказанай калізіі, забеспячэння адназначнага разумення і аднастайнага прымянення норм заканадаўства Канстытуцыйны Суд прапанаваў унесці адпаведныя змяненні ў ПК.

Выяўленая Канстытуцыйным Судом калізія паміж нормамі ПК і ўказанага Закона ў частцы ўстанаўлення дадатковай падставы спынення працоўнага дагавора з дзяржаўнымі службовымі асобамі ў выпадках непадпісання або парушэння імі пісьмовага абавязацельства па выкананні прадугледжаных заканадаўствам аб барацьбе з карупцыяй абмежаванняў устаранёна Законам аб унясенні змяненняў у ПК шляхам выкладання пункта 5 артыкула 47 ПК у новай рэдакцыі. Тым самым улічаны прынцып прававой дакладнасці, створаны ўмовы для адназначнага разумення і аднастайнага прымянення норм дадзеных заканадаўчых актаў.

4.4. У мэтах рэалізацыі канстытуцыйных прынцыпу роўнасці ўсіх перад законам і норм, якія гарантуюць права на працу, Канстытуцыйным Судом прынята рашэнне ад 4 кастрычніка 2011 г. «О некоторых вопросах правового регулирования предоставления отпуска по уходу за ребенком», у якім указана, што непрадастаўленне водпуску па догляду дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў працуючым бацьку, іншым сваякам дзіцяці ў выпадку, калі маці дзіцяці з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, не заснавана на канстытуцыйных прынцыпах і нормах, якія вынікаюць з сутнасці Рэспублікі Беларусь як сацыяльнай прававой дзяржавы, абумоўлена наяўнасцю прабелу ў рэгуляванні адносін, якія складваюцца ў гэтай сферы, што на практыцы прыводзіць да парушэння правоў і законных інтарэсаў грамадзян.

Канстытуцыйны Суд прызнаў неабходным устараніць прабел у прававым рэгуляванні адносін, якія датычацца прадастаўлення водпуску па догляду дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, шляхам заканадаўчага замацавання права працуючых бацькі, іншых сваякоў дзіцяці, якія фактычна ажыццяўляюць догляд дзіцяці, на прадастаўленне ім указанага водпуску і ў тым выпадку, калі маці дзіцяці з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам.

У адпаведнасці з Законам аб унясенні змяненняў у ПК артыкул 185 ПК выкладзены ў новай рэдакцыі, згодна з якой водпуск па догляду дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў можа быць прадастаўлены сваяку, члену сям'і дзіцяці, які фактычна ажыццяўляе за ім догляд, у выпадку занятасці маці дзіцяці (праца, служба, навучанне) або ажыццяўлення ёю самастойных відаў дзейнасці, прадугледжаных заканадаўствам (гэта значыць у выпадках, калі маці з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, натарыусам, адвакатам, творчым работнікам, асобай, якая ажыццяўляе рамесную дзейнасць, дзейнасць у сферы аграэкатурызму).

У той жа час Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу на існуючае зацягванне працэсу выканання асобных рашэнняў Суда, накіраваных на ліквідацыю прабелаў, выключэнне калізій і прававой недакладнасці, і адзначае, што несвоечасовае выкананне такіх рашэнняў Канстытуцыйнага Суда азначае магчымасць працягласці нічым не апраўданага захавання ў прававым полі нарматыўных прававых актаў, што змяшчаюць прававыя прабелы, калізіі і прававую недакладнасць, прымяненне якіх можа пацягнуць парушэнне прынцыпу вяршэнства Канстытуцыі, аслабіць гарантыі абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян і арганізацый.

V

1. Аналіз спраў і матэрыялаў, разгледжаных Канстытуцыйным Судом, дазваляе зрабіць вывад аб накіраванасці намаганняў дзяржаўных органаў і службовых асоб на падтрыманне належнага ўзроўню канстытуцыйнай законнасці як рэжыму няўхільнага выканання Канстытуцыі ў нарматворчасці і правапрымяненні ўсімі суб'ектамі права.

У 2013 годзе не было выяўлена выпадкаў істотнага парушэння канстытуцыйных палажэнняў у заканатворчым працэсе. Усе законы, прааераныя ў парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю, прызнаны адпаведнымі Канстытуцыі. У рашэннях і прававых пазіцыях Канстытуцыйнага Суда, прынятых па выніках праверкі канстытуцыйнасці законаў, адзначаны станоўчыя тэндэнцыі, якія сведчаць аб развіцці канстытуцыйных прынцыпаў і норм у прававым рэгуляванні грамадскіх адносін. Выяўленыя прававыя прабелы і прававая недакладнасць у заканадаўчых актах не носяць сістэмнага характару і могуць быць устаранёны ў працэсе ўдасканалвання заканадаўчага рэгулявання.

2. Канстытуцыяналізацыя грамадскіх адносін прадугледжвае прамое ўздзеянне канстытуцыйных прынцыпаў і норм на сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя працэсы пры дапамозе прававых механізмаў забеспячэння вяршэнства Канстытуцыі і яе прамога дзеяння.

Канстытуцыяналізацыя грамадскіх адносін у Рэспубліцы Беларусь патрабуе мэтанакіраванага правядзення навукова абгрунтаванай прававой палітыкі дзяржавы. Прынятыя раней Канцэпцыя судова-прававой рэформы (1992 год) і Канцэпцыя ўдасканалвання заканадаўства (2002 год) адыгралі важную ролю ў станаўленні прававой сістэмы суверэннай дзяржавы. Разам з тым дасягнуты ўзровень дзяржаўнага будаўніцтва і сацыяльна-эканамічнага развіцця, існуючыя інтэграцыйныя працэсы абумоўліваюць неабходнасць распрацоўкі комплекснага дакумента — адзінай Канцэпцыі дзяржаўнай прававой палітыкі Рэспублікі Беларусь у мэтах належнага прававога забеспячэння дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, правоў і свабод грамадзян у сучасных умовах.

3. Пры выпрацоўцы стратэгіі прававой палітыкі дзяржавы, удасканальванні прававой сістэмы неабходна грунтавацца на канстытуцыйна-прававой дактрыне, якая ўяўляе сабой тэарэтычныя палажэнні і навуковыя канцэпцыі, усведамленне і разуменне канстытуцыйных ідэй, каштоўнасцей і мэт, рэалізацыю і развіццё, інтэрпрэтацыю і дактрынальнае тлумачэнне канстытуцыйных прынцыпаў і норм як у навуковых крыніцах, так і ў нарматворчасці і правапрымяненні.

Пэўны ўклад у фарміраванне нацыянальнай канстытуцыйна-прававой дактрыны ўносіць Канстытуцыйны Суд, які сваімі рашэннямі і прававымі пазіцыямі пры дапамозе выяўлення канстытуцыйна-прававога сэнсу норм законаў сцвярджае вяршэнства Канстытуцыі, садзейнічае выпрацоўцы дзейснага механізму забеспячэння правоў і свабод чалавека.

4. Захаванне стабільнасці фундаментальных канстытуцыйных палажэнняў спрыяе паступальнаму развіццю дзяржавы і грамадства, удасканальванню механізмаў канстытуцыйна-прававой абароны правоў і свабод грамадзян. Разам з тым далейшае развіццё грамадскіх адносін не выключае магчымасці пэўнай карэкціроўкі асобных норм Канстытуцыі ў напрамку далейшай аптымізацыі канстытуцыйна-прававога рэгулявання з улікам узнікнення аб'ектыўных абставін.

Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу на тое, што з прыняццем у адпаведнасці з артыкулам 109 Канстытуцыі заканадаўчых актаў, накіраваных на стварэнне адзінай сістэмы судоў агульнай юрысдыкцыі, аб'яднаннем Вярхоўнага Суда і Вышэйшага Гаспадарчага Суда ў адзіны вышэйшы судовы орган — Вярхоўны Суд узнікла аб'ектыўная неабходнасць удакладнення некаторых палажэнняў Канстытуцыі ў мэтах ліквідацыі прававой недакладнасці.

У сувязі з гэтым Канстытуцыйны Суд мяркуе, што, улічваючы месца і ролю Вярхоўнага Суда ў судовай сістэме Рэспублікі Беларусь, грунтуючыся на канстытуцыйным прынцыпе падзелу ўлад, неабходна на канстытуцыйным узроўні замацаваць статус Вярхоўнага Суда як вышэйшага судовага органа, які ўзначальвае сістэму судоў агульнай юрысдыкцыі.

Пры гэтым у мэтах пашырэння доступу да канстытуцыйнага правасуддзя мэтазгодна надзяліць Генеральнага пракурора правам унясення прапаноў у Канстытуцыйны Суд аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў, а суды агульнай юрысдыкцыі — правам прэюдыцыяльнага запыту ў Канстытуцыйны Суд.

5. Вяршэнства Канстытуцыі ў прававым рэгуляванні ўдзелу Рэспублікі Беларусь у міжнародных зносінах зацвярджаецца выходзячы з наступных канстытуцыйных палажэнняў.

Адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца народ, які ажыццяўляе сваю ўладу непасрэдна, праз прадстаўнічыя і іншыя органы ў формах і межах, вызначаных Канстытуцыяй. Будучы паўнапраўным суб'ектам сусветнай супольнасці, валодаючы вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, Рэспубліка Беларусь самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку, прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства, у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права можа на добраахвотнай аснове ўваходзіць у міждзяржаўныя ўтварэнні і выходзіць з іх. Пры гэтым не дапускаецца заключэнне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі.

Адкрытасць Рэспублікі Беларусь для міжнародна-прававой інтэграцыі абумоўлівае магчымасць перадачы часткі суверэнных паўнамоцтваў наднацыянальным структурам міждзяржаўных аб'яднанняў. Канстытуцыйны Суд адзначае, што пры гэтым, зыходзячы з вяршэнства Канстытуцыі, не могуць абмяжоўвацца суверэннае права народа Беларусі самастойна вызначаць свой шлях развіцця, змяняцца дэмакратычны, сацыяльны і прававы характар беларускай дзяржавы, змяншацца канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзян.

6. Канстытуцыя — Асноўны Закон, які не толькі замацоўвае прынцыпы і нормы, па якіх дзяржава і грамадства жывуць у цяперашні час, але і вызначае шляхі развіцця Рэспублікі Беларусь на доўгатэрміновую перспектыву як дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы, у якой чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы.

У Канстытуцыі закладзены значны патэнцыял прававых пераўтварэнняў. Шляхам тлумачэння канстытуцыйных палажэнняў, выяўлення канстытуцыйна-прававога сэнсу норм заканадаўчых актаў абагачаецца змест Канстытуцыі, ажыццяўляецца яго прырашчэнне дактрынальнымі палажэннямі. Гэта шматразова ўзмацняе рэгулятыўны патэнцыял Канстытуцыі, адкрывае прастор яе прамому дзеянню, дазваляе грамадзянам і службовым асобам успрымаць Асноўны Закон нашай дзяржавы не проста як сукупнасць прававых норм і прынцыпаў, што валодаюць вышэйшай юрыдычнай сілай, а як напоўнены рэальным зместам грамадскі дагавор, на аснове якога дасягаюцца грамадская згода і давер паміж асобай, грамадствам і дзяржаўнай уладай.

7. Увасабленне ў жыццё вяршэнства і прамога дзеяння Канстытуцыі, умацаванне канстытуцыйнай законнасці абумоўліваюць станаўленне ў Рэспубліцы Беларусь канстытуцыяналізму, важнейшымі складальнікамі якога выступаюць вяршэнства права, няўхільнае выкананне канстытуцыйных прадпісанняў усімі дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі, службовымі асобамі і грамадзянамі, устанаўленне балансу інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы на аснове канстытуцыйных каштоўнасцей.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што ўмацаванне ва ўсіх сферах дзяржаўнага і грамадскага жыцця канстытуцыйнай законнасці, забеспячэнне канстытуцыяналізацыі грамадскіх адносін, фарміраванне канстытуцыйнай культуры з'яўляюцца абавязкам усіх дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў, службовых асоб і грамадзян. Праз асэнсаванне і рэалізацыю канстытуцыйных палажэнняў адбываецца станаўленне чалавека і грамадзяніна як носьбіта канстытуцыйных правоў, свабод і абавязкаў, актыўнага ўдзельніка канстытуцыйных адносін.

Гэта Пасланне прынята на пасяджэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь 21 студзеня 2014 г.

Старшынствуючы —
Старшыня Канстытуцыйнага
Суда Рэспублікі Беларусь
П.П.Міклашэвіч.

ВЫДАТКІ НА ТЭЛЕФОН — ПАД «МАБІЛЬНЫМ КАНТРОЛЕМ»

Па інфармацыі аператара сотавай сувязі «МТС», больш як 10% абанентаў, якія тэлефануюць у кантактны цэнтр аператара, цікавяцца менавіта спісаннем грошай. Цяпер адказ на гэтае пытанне можна атрымаць самастойна і бясплатна — кампанія запусціла новы бясплатны сэрвіс, які хутка адкажа на пытанне аб спісанні грошай.

Для таго, каб даведацца, за якія паслугі спісаліся грошы, трэба зрабіць USSD-запыт

*145# і націснуць на кнопку выкліку. Праз некалькі секундаў абаненту паступіць паведамленне, дзе будуць указаны дата, час і кошт апошніх пяці платных дзеянняў — званкоў, SMS, інтэрнэт-сесій (сумарна за апошнюю гадзіну), абаненцкай платы іншых паслуг, што тарыфікуюцца.

Сэрвіс даступны ў тым ліку і абанентам, якія знаходзяцца ў роўмінгу. Прычым нават за межамі «роднай сеткі» ён застаецца для іх бясплатным, што дазволіць беларусам зручна і аператыўна кантраляваць свае выдаткі на паслугі сувязі за мяжой.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Технический администратор доменной зоны BY
УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ»
сообщает о проведении благотворительного аукциона на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра.

Средства от аукциона, кроме стандартной стоимости услуг по регистрации доменного имени и налогов, будут перечислены на нужды детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей.

Предметом аукциона являются доменные имена в доменной зоне BY, исключенные из реестра национальной доменной зоны. Перечень доменных имен, предлагаемых к регистрации по результатам аукциона, размещен на сайте https://auction.cctld.by

Дата начала аукциона – 10 марта 2014 г., дата окончания аукциона – 20 марта 2014 г.

Время начала аукциона – 12.00 даты начала аукциона, время окончания аукциона – 12.00 даты окончания аукциона. В случае, если в течение последних 2 минут до окончания аукциона была сделана ставка, срок проведения аукциона автоматически продлевается еще на 5 минут.

Аукцион проводится на интернет-ресурсе http://auction.cctld.by

В отношении каждого доменного имени, являющегося предметом аукциона, размещается программная форма, позволяющая участникам аукциона делать ставки.

Участниками аукциона могут быть юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, являющиеся резидентами или нерезидентами Республики Беларусь. Для участия в аукционе участник должен пройти регистрацию на сайте http://auction.cctld.by

Начальная цена предмета аукциона составляет 300 000 белорусских рублей. Шаг аукциона – 50 000 белорусских рублей.

Прием ставок прекращается по истечении 10 календарных дней после начала аукциона по каждому доменному имени.

Аукцион считается состоявшимся при наличии хотя бы одной ставки.

Победившим в аукционе считается тот участник, который сделал максимальную ставку к моменту окончания аукциона.

Текст Положения о порядке проведения аукциона на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра, находится на сайте http://auction.cctld.by в разделе «Правила проведения аукционов»

Организатор аукциона: УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ», УНП 100160363, e-mail: au@hoster.by

Тел. организатора +375 17 239 57 02.

Тел. комиссии по организации и проведению аукциона +375 17 239 57 77.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**ЛОТ № 1: Изолированное помещение с инвентарным номером 252/D-88001, площадью 380,4 кв.м, наименование – помещение транспортного назначения № 1, назначение – помещение транспортного назначения, стоимостью 467 000 000 белорусских рублей.** **ЛОТ № 2: Изолированное помещение с инвентарным номером 252/D-88004, площадью 1 394,5 кв.м, наименование – помещение блока ремонтных цехов № 1, назначение – помещение транспортного назначения, стоимостью 1 280 000 000 белорусских рублей.**
Собственник (владелец) имущества	**Открытое акционерное общество «Сантиз» (Витебская область, г. Новополоцк, проезд Устье, д. 5, пом. 2)**
Местонахождение (адрес) имущества	Лот № 1 – Витебская область, г. Новополоцк, пр-д Устье, 11 А-1. Лот № 2 – Витебская область, г. Новополоцк, пр-д Устье, 7-1.
Информация об имеющихся обременениях имущества	Запрет совершения регистрационных действий в Новополоцком бюро Полоцкого филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».
Место (адрес), дата и время проведения торгов	**Витебская обл., г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 322, 20 февраля 2014 года в 15 часов 00 минут.**
Справочная информация об организаторе торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома; 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 322. Судебный исполнитель – Лесковец Денис Анатольевич, тел. 8 (0212) 49 13 46.
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в тортах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в филиале № 200 – Витебское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНН 300002505, не позднее 14 часов 30 минут 20.02.2014 года. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.

Гродненский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- капитальное строение, инв. № 400/С-3141 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – вспомогательное здание погрансервиса) с составными частями и принадлежностями, площадью 379,7 кв.м; - капитальное строение, инв. № 400/С-59195 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – контрольно-пропускной пункт), площадью 47,9 кв.м; - котел КВТ-31,5 «Тиссом-1»; - электромеханический шлагбаум; - котел КЧМ-5К-96; - шкаф управления ШУ-РА 1100.0000.00.1-220 IP54; - клапан регулирующий RV 103 ERA 4321-16/150-20; - датчик ДТТА – тип 3 быстрый с бобышкой; - сигнализатор горючих газов СГГ6М; - сигнализатор горючих газов СГМН-1MG6; - напоромер НМП-52-М. **Адрес: Гродненский р-н, район ППТО «Брузги»**
Обременения на объект со стороны 3-х лиц	- капитальное строение (вспомогательное здание погрансервиса) с инвентарным номером 400/С-3141 - арендуемая площадь: 265,2 м кв. (офис, камера хранения, санузел, тамбур, розничная торговля, склад, подвал, котельная, туалеты и душевые, часть теневого навеса, операторская АЗС), срок действия договора аренды – до 01.12.2015; 72,6 м кв. (помещение кафе), срок действия договора аренды – до 01.02.2015; 189 м кв. (часть асфальтобетонного покрытия), срок действия договора аренды – до 01.03.2014; 91 м кв. (часть асфальтобетонного покрытия), срок действия договора аренды – до 15.03.2015; 15 727 м